Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна"
Кафедра гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі

# МОЎНАКУЛЬТУРНАЯ ПРАСТОРА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ

Зборнік навуковых артыкулаў

Брэст
"Альтернатива"
2010

УДК 81'1(476.7)(082)
ББК 81
М85

*Рэдакцыйная калегія:*
канд. філал. навук, дац., заг. каф. М.М. Аляхновіч;
канд. філал. навук, дац. Л.В. Леванцэвіч;
канд. філал. навук, дац. С.С. Клундук;
канд. філал. навук, дац. І.Ул. Сацута;
канд. філал. навук, дац. Н.Р. Якубук

*Рэцэнзенты*:
д-р філал. навук, праф. (УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І.П. Шамякіна") В.В. Шур;
заг. каф. агульнага і рускага мовазнаўства,
канд. філал. навук, дац. (УА "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна") В.Б. Пераход

У афармленні вокладкі выкарыстаныя здымкі Ул. А. Сенькаўца

М85 **Моўнакультурная** прастора Берасцейшчыны : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, Каф. гісторыі беларус. мовы і дыялекталогіі ; рэдкал. : М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2010. – 240 с.

ISBN 978-985-521-176-2.

У зборнік уключаны матэрыялы па праблемах даследавання моўнакультурнай прасторы Берасцейшчыны.

**УДК 81'1(476.7)(082)**
**ББК 81**

**ISBN 978-985-521-176-2**

© УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»
© Афармленне. ПВГУП «Выдавецтва "Альтэрнатыва"», 2010

## ЗМЕСТ


Евгения Абрамова (Брест) О РАЗГОВОРНО-ПРОСТОРЕЧНОЙ «СТИХИИ» В ЯЗЫКЕ ХУ-ДОЖЕСТВЕННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ КОНЦА XX - НАЧАЛА XXI ВВ.. ..... 3

Мікалай Аляхновіч (Брэст) МОЎНАКУЛЬТУРНАЯ ПРАСТОРА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ ..... 7

Ніна Аляхновіч (Брэст) ВОБРАЗНАЯ АСНОВА ПАЭТЫЧНАГА РАДКА ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ ..... 10

Аляксандр Башкоў (Брэст) АРХЕАЛОГІЯ БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ ..... 12

Ніна Борсук (Брэст) ГІСТОРЫЯ ГОРАДА БРЭСТ-ЛІТОЎСКА КАНЦА XIX - ПАЧ. XX СТСТ. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПЕРШАГА КАЛЕНДАРА-ДАВЕДНІКА Г. БРЭСТ-ЛІТОЎСКА 1912 Г.) ..... 16

Святлана Бут-Гусаім (Брэст) АНТРАПАНІМІЧНАЯ ПРАСТОРА ПАЛЕСКІХ ТВОРАЎ ГЕОРГІЯ МАРЧУКА ..... 19

Аляксандр Васільчук ( Брэст) ДА ПЫТАННЯ АДМЕТНАСЦІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ ВЯСНЯНАК НА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЕ ..... 24

Галіна Верамяюк (Брэст) НАЙМЕННІ ЖОНАК І ДАЧОК У СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ ..... 28

Алена Воінава, Алена Палуян (Гомель) НАЙМЕННІ АСОБ У ГАВОРКАХ БРЭСТЧЫНЫ ..... 30

Мікола Гарбачык (Брэст) СКЛАНЕННЕ НАЗОЎНІКАЎ НІЯКАГА РОДУ Ў ТАРАКАНСКІХ ГАВОРКАХ ..... 34

Пётр Гарбуль (Брэст) НАСЕЛЬНІЦТВА І САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ СФЕРА ГОРАДА БРЭСТА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ. ..... 37

Таццяна Гераськіна (Брэст) АСАБЛІВАСЦІ ЎЖЫВАННЯ АД'ЕКТЫВАВАНЫХ ДЗЕЕПРЫМЕТНІКАЎ У ТВОРАХ ПІЛІПА ПЕСТРАКА ..... 40

Зоя Заіка (Брэст) УНУТРЫМОЎНЫ ПРОЗВІШЧНЫ ТЫП У АРЭАЛЕ ПАГАРЫННЯ ..... 43

Алесь Зайка (в. Заполле, Івацэвіцкі раён) ФРАЗЕАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК КОСАЎШЧЫНЫ ..... 45

Зайцева Марина (Брест) КОНЦЕПТЫ «СВЕТ» И «ТЬМА» В ПОВЕСТИ И.А. БУНИНА «СУХОДОЛ» ..... 48

Алена Кавалюк (Брэст) ПІНСКАЕ ПАЛЕССЕ І ЯГО ЛЮДЗІ Ў ВЫДАННІ XIX СТ. "ЖЫВАПІСНАЯ РАСІЯ" ..... 51

Людміла Казлянка (Брэст) МОЎНАЯ АДАПТАЦЫЯ ПАЗЫЧАННЯЎ: ВОПЫТ І ПРАКТЫКА ЛЕКСІКАГРАФІІ ..... 56

Галіна Канцавая (Брэст) БАЛІЯ, БІЙКА, ВЫВАРКА… (НАЗВЫ ПОСУДУ Ў ДЫЯЛЕКТНАЙ МОВЕ) ..... 58

Станіслава Каралевіч (Брэст) НЕАФІЦЫЙНЫЯ НАЙМЕННІ ЖЫХАРОЎ ВЁСКІ ВУЛЬКА ЛАЎСКАЯ ПІНСКАГА РАЁНА ..... 62

Аляксандр Карповіч (Стахаўская СШ Столінскага раёна) ПРАВАСЛАЎНАЯ ЦАРКВА НА СТОЛІНШЧЫНЕ Ў 1920 – 1930-Я ГГ. ..... 67

Валянціна Касцючык (Брэст) КОРАНЬ У ЭКСПРЭСІЎНЫХ СЛОВАХ БРЭСТЧЫНЫ ..... 75

Ганна Кірыенка (Брэст) СЛАВЯНСКАЯ МІФАЛОГІЯ Ў КАНТЭКСЦЕ ТВОРЧАСЦІ ЗІНАІДЫ ДУДЗЮК ..... 79

*пысьмі* і *пысьмовэ, полотні* і *полотновэ, волокні* і *волокновэ, сукні* і *сукновэ, выслі* і *words* і *вырытіні* і *вырытіновэ, выні* і *выновэ; (на, у, пры) полінэ* і *поліновэ, словэ* і *слововэ, мнесэ* і *мнесовэ, тілэ* і *тіловэ, колысэ* і *колысовэ, сінэ* і *сіновэ, салэ* і *саловэ, маслэ* і *масловэ, мэлэ* і *мэловэ, горлэ* і *горловэ, тістэ* і *тістовэ, жэтэ* і *жэтовэ, золотэ* і *золотовэ, болотэ* і *болотовэ, літэ* і *літовэ, светэ* і *световэ, долотэ* і *долотовэ, шмаровэдлэ* і *шмаровэдловэ*. Назоўнік *йіца* (аснова на зацвярдзелы) у месным склоне мае варыянтныя канчаткі *-і* і *-овэ*: *в йіці* і *в йіцовэ*. Назоўнікі з асновай на зацвярдзелы ўжываюцца з варыянтнымі канчаткамі *-ы* і *-овэ*: *(на, у, пры) нутры* і *нутровэ, рыбры* і *рыбровэ, быдры* і *быдровэ, гозыры* і *гозыровэ, люстры* і *люстровэ, ломаччы* і *ломаччовэ, зборышчы* і *зборышчовэ, пожарышчы* і *пожарышчовэ, сонцэ* і *сонцовэ*; назоўнікі на заднеязычны ў месным склоне прадстаўлены наступнымі разнавіднасцямі канчаткаў: *-і* (чаргуецца з *ц, г – з, с*) і *-овэ* : *(на, у, пры) молоці* і *молоковэ, гочці* і *гочковэ, гусі* і *гуховэ, вічці* і *вічковэ* (пры гэтым адзначаецца паралельнае ўжыванне: *в гуху, в гусі і в гуховэ, в вічку, в вічці і в вічковэ*); канчаткі *-у* (калі к не чаргуецца з *ц, г – з, с*) і *-овэ*: *(на, у, пры) гоблаку* і *гоблаковэ, люстарку* і *люстарковэ, гультайіску* і *гультайісковэ, хвальку* і *хвальковэ, гумнэску* і *гумнэсковэ, повіку* і *повіковэ, лэку* і *лэковэ, лэху* і *лэховэ, бруху* і *бруховэ*; назоўнікі з асновай на мяккія зычныя з націскам на аснове маюць варыянтныя канчаткі *-і* і *-ёвэ* (з націскам на канчатку): *(на, у, пры) місті* і *містёвэ, шчасті* і *шчастёвэ, помісті* і *помістёвэ, голлі* і *голлёвэ, гныллі* і *гныллёвэ, ворынні* і *ворыннёвэ, смітті* і *сміттёвэ, здоровйі* і *здоровйёвэ*.

Такім чынам, назоўнікі ніякага роду ў адзіночным ліку ў тараканскіх гаворках маюць варыянтныя канчаткі, утвараючы паралельныя формы: Н. скл.: *-о, -э, -е, -ё*; Р. скл.: *-а, -я, -е*; Д. скл.: *-у* і *-овэ, -ю* і *-ёвэ*; В. скл.: *-о, -э, -е, -ё*; Т. скл.: *-ом, -эм, -ем, -ём*; М. скл.: *-і* і *-овэ, -э* і *-овэ, -ы* і *-овэ, -і, -э* і *-овэ, -у* і *-овэ*. Такая варыянтнасць абумоўлена рознымі лінгвістычнымі і экстралінгвістычнымі фактарамі, у першую чаргу гістарычнымі зменамі ў марфалогіі назоўніка, зменамі ў вакалізме і кансанантызме брэсцка-пінскіх гаворак, а таксама ўплывам сумежных гаворак.

**Літаратура**

1. Блінава, Э. Беларуская дыялекталогія : вучэб. дапаможнік для філал. фак. ВНУ. / Э. Блінава, Е. Мяцельская. – 2-е выд. – Мінск : Выш. школа, 1980. – 306 с.

Пётр Гарбуль (Брэст)

## НАСЕЛЬНІЦТВА І САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ СФЕРА ГОРАДА БРЭСТА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

Другая палова XIX ст. з'яўляецца перыядам найбольш дынамічнага развіцця горада. Пашырэнне гандлю, узнікненне новых прамысловых прадпрыемстваў, павелічэнне рамеснай вытворчасці і асабліва будаўніцтва чыгунак прывялі да хуткага росту насельніцтва Брэста. Па колькасці жыхароў ён увайшоў у чацвёрку буйнейшых гарадоў Беларусі, а ў межах Гродзенскай губерні ўвогуле стаў самым вялікім. У 1861 г. у Брэсце налічвалася 20 635 чалавек. Больш насельніцтва на гэты час мелі толькі Магілёў (31 062), Віцебск (30 664), Мінск (26 760).

Брэсцкае жыхарства належыла да розных сацыяльных груп. Самую

вялікую з іх утваралі мяшчане. Гэтае саслоўе складалася ў асноўным з дробных домаўладальнікаў, гандляроў, рамеснікаў і налічвала 13 138 чалавек. Большасць мяшчан мела свае дамы. Мяшчане хрысціянскага веравызнання займаліся земляробствам, агародніцтвам, рамёствамі. Частка іх працавала на фабрыках і заводах, складала асноўную масу чорнарабочых і наймітаў. Яўрэйскае насельніцтва ў большасці сваёй было занята гандлем, дробнымі рамёствамі.

Дваране, чыноўнікі, духавенства, багатае купецтва адносіліся да гарадской вярхушкі. Так гістарычна склалася, што ў параўнанні з іншымі гарадамі губерні дваран у Брэсце было значна менш – усяго крыху больш за 1 000 чалавек. Праваслаўнае, каталіцкае і іудзейскае духавенства горада складала групу з 61 чалавека. Купецкае саслоўе налічвала 325 чалавек. Акрамя таго, у Брэсце пражывалі 5 978 вайскоўцаў, 105 сялян і 11 замежных падданых. З агульнай колькасці гарадскога насельніцтва мужчыны складалі 13 638, жанчыны – 7 305 чалавек. Такая перавага мужчынскага жыхарства тлумачыцца наяўнасцю ў Брэсцкай крэпасці даволі вялікага гарнізона.

На патрэбы брастаўчан у 1857 г. было скарыстана 5 000 быкоў і кароў, 500 баранаў, 3 000 цялят, 8 000 чвэрцей пшаніцы, 25 000 – жыта, 15 000 – аўса, 3 000 – гароху, 10 000 – ячменю, 1 000 – грэчкі. Утрыманне насельніцтва ў 1860 г. абыходзілася гарадской казне ў 556 830 рублёў, за выключэннем кошту віна, гародніны і свечак. У тым жа годзе ў Брэсце быў зарэгістраваны 181 шлюб, нарадзілася 583 дзіцяці, памерла 578 жыхароў.

Да 1889 г. насельніцтва горада падвоілася і склала лічбу 41 615 чалавек, з якіх мужчын было 21 509 і жанчын – 20 106. Па сацыяльным складзе гараджане падзяляліся наступным чынам: дваране – 206 чалавек, духавенства розных канфесій – 29, купцы – 400, мяшчане – 32 558, цэхавыя – 906, сяляне – 925, вайскоўцы – 5 011, замежныя падданыя – 151. У канцы стагоддзя колькасць жыхароў Брэста яшчэ павялічылася і па дадзеных перапісу 1897 г. дасягнула лічбы 46 568 чалавек. Саслоўнае дзяленне засталося ранейшым: дваран налічвалася 1 674, духавенства – 75, купцоў – 485, мяшчан – 33 860, сялян – 9 759, замежных падданых – 91, астатніх – 624 чалавекі.

Брэст развіваўся як шматнацыянальны горад. У ім жылі беларусы, рускія, яўрэі, палякі, татары, немцы, французы. Аднак устанавіць дакладную іх колькасць не ўяўляецца магчымым, таму што статыстыка тых часоў падзяляла насельніцтва не па нацыянальнасці, а па веравызнанні. У адпаведнасці з рэлігійнай прыналежнасцю, у 1897 г. у горадзе вылучалі 5 асноўных груп насельніцтва: іудзеі – 30 260, праваслаўныя – 12 141, каталікі – 3 494, мусульмане – 340, пратэстанты – 273 чалавекі. Яшчэ 60 чалавек адносіліся да іншых канфесій.

Дадзеныя першага ў межах Расійскай імперыі перапісу насельніцтва 1897 г. даюць магчымасць размеркаваць жыхароў Брэста па роднай мове. Сярод брастаўчан роднай мовай лічылі: яўрэйскую – 30 109, рускую і беларускую – 12 152, польскую – 3 358, нямецкую – 213, татарскую – 318, літоўскую – 13, іншыя мовы – 405 чалавек [1, с. 117].

У грамадскую адміністрацыйна-кіруючую дзейнасць горада была ўцягнута нязначная частка найбольш прывілеяваных і заможных жыхароў. Новае гарадавое палажэнне ад 16 чэрвеня 1870 г. перадавала распарадчую ўладу ў гарадах па пытаннях народнай адукацыі, аховы здароўя, развіцця гандлю,

прамысловасці і добраўпарадкавання бессаслоўным гарадскім думам, якія выбіраліся гарадскімі падаткаплацельшчыкамі на 4 гады. Выбаршчыкі, узроставы цэнз якіх складаў 25 гадоў, падзяляліся на 3 разрады, аднолькавыя па суме выплачваемых падаткаў. Кожны разрад выбіраў у думу трэцюю частку гласных. Са свайго саставу гласныя думы выбіралі выканаўчы орган думы – гарадскую ўправу і гарадскога галаву, які адначасова з'яўляўся старшынёй гарадской думы. Сфера спраў брэсцкай думы і ўправы зводзілася да пытанняў замошчвання вуліц, устаноўкі ліхтароў, будаўніцтва калодзежаў, адкрыцця навучальных устаноў, начлежных дамоў, а таксама выканання ўрадавых прадпісанняў.

У даследуемы перыяд Брэст інтэнсіўна забудоўваўся, узводзіліся жыллёвыя і грамадскія будынкі, прадпрыемствы. Калі ў 1863 г. у горадзе былі 824 дамы, з якіх толькі 56 – мураваныя, то ў 1889 г. ужо налічвалася 2 663 будынкі, з якіх 248 – мураваныя. Архітэктурнае аблічча Брэста вызначалі ўзведзены у 1856 г. у стылі класіцызму кафедральны Крыжаўзвіжанскі касцёл і пабудаваны ў 1865 г. у руска-візантыйскім стылі Сімяонаўскі сабор, якія і сёння ўпрыгожваюць горад. Цікавыя комплексы будынкаў узніклі ўздоўж брэсцкіх бульвараў (цяпер вуліцы Гогаля і Міцкевіча). Асаблівай увагі заслугоўвае пабудаваны ў 1886 г. у паўночна-заходняй частцы горада па праекце архітэктара Б. Лорберга, інжынераў Л. Нікалаі і Я. Гарбунова Цэнтральны чыгуначны вакзал. Ён з'яўляўся адным з буйнейшых у Расіі, меў адно з першых на чыгуначным транспарце імперыі электрычнае асвятленне. У залах, службовых памяшканнях і на перонах было ўстаноўлена 160 электрычных лямпачак розных канструкцый. Ток для накалу гэтых лямпачак выпрацоўваўся трыма дынама-машынамі, якія прыводзіліся ў дзеянне паравымі машынамі, магутнасцю ў 20 конскіх сіл кожная. Будаўніцтва вакзала каштавала расійскаму ўраду больш за 2 млн. рублёў золатам [1, с. 153].

Сярод іншых будынкаў, як сцвярджае энцыклапедычны слоўнік 1891 г., у Брэсце меліся 1 капліца, 1 лютэранскі малітоўны дом, 2 сінагогі, 32 іншыя малітоўныя дамы, мытня і лазня.

Разам з тым, гораду патрабавалася вялікая работа па добраўпарадкаванні. Начное асвятленне мелася толькі ў цэнтральнай частцы Брэста. Гэтая праблема была вырашана ў канцы стагоддзя, калі ўстанавілі ў розных кутках горада 440 ліхтароў. Падчас веснавога разліву ракі Мухавец некалькі вуліц горада (Мухавецкая, Кобрынская, Шырока-Слабодская) часткова ці поўнасцю затапліваліся. Пабудаваная ў 1870-я гады бойня не была абсталявана ачышчальнымі збудаваннямі і таму моцна забруджвала горад. Акрамя таго, Брэст у XIX ст. не меў каналізацыі, што таксама адбівалася на яго санітарным становішчы. Гарадская дума ў 1882 г. скардзілася губернатару, што берагі Мухаўца, якія прылягаюць да горада, уяўляюць сабой балота, што падысці да ракі зусім немагчыма. Водазабеспячэнне горада было нездавальняючым. Ваду для сваіх патрэб гараджане бралі непасрэдна з Мухаўца, які быў забруджаны гарадскімі адкідамі. У 1895 г. дзейнічалі толькі 4 вялікія і 3 малыя грамадскія калодзежы, вада ў якіх была добрай якасці. Такое становішча прымусіла гараджан у маі 1898 г. звярнуцца ў гарадскую думу з прашэннем аб паляпшэнні водазабеспячэння Брэста.

Засмечанасць двароў і вуліц, неасцярожнае абыходжанне з агнём часта прыводзілі да пажараў. Іх рэгістравалася па некалькі ў год. Так, у 1884 г. у Брэсце адбылося 11, у 1887 г. – 8, у 1895 г. – 5, у 1899 г. – 23 пажары. Самы вялікі пажар здарыўся 4 мая 1895 г., калі згарэла большая частка горада. У 48-мі кварталах агонь знішчыў 1 600 дамоў, 2 бальніцы, аптэку, багадзельню, 2 вучылішчы,

4 бровары, 15 гільзавых і 3 тытунёвыя фабрыкі, 13 мануфактурных і 104 харчовыя крамы, 38 пякарняў, бойню і чыгуначны вакзал. Падчас пажару загінулі 42 чалавекі і 21 905 пацярпелі. Агульныя выдаткі склалі каля 5 млн. рублёў. У выніку цэнтр горада ператварыўся ў пустэчу [1. с. 116].

Медыцынскія ўстановы горада не маглі поўнасцю задаволіць патрэбы жыхароў. На працягу 1850-х – 1880-х гг., калі насельніцтва павялічылася ўдвая, у Брэсце дзейнічала толькі адна бальніца з абмежаванымі магчымасцямі. Яна не мела нават свайго будынка, а размяшчалася ў наёмным доме, у якім дзейнічалі дзве палаты на 15 ложкаў (10 – для мужчын, 5 – для жанчын). У штат бальніцы ўваходзілі ўрач, фельчар, 4 санітары і наглядчык. Акрамя гарадской існавала яўрэйская бальніца на 45 ложкаў. Хворых жа было значна больш, чым маглі прыняць бальніцы горада. У перыяд эпідэмій, якія здараліся кожны год, у Брэсцкім павеце захворваў кожны 4-ы жыхар. 11% ад захварэлых паміралі. Асабліва высокай была смяротнасць сярод дзяцей – больш за 25% з іх паміралі ва ўзросце да 5 гадоў. Толькі ў канцы стагоддзя медыцынскае абслугоўванне брастаўчан некалькі палепшылася. У 1895 г. ужо дзейнічала 12 бальнічных устаноў на 713 ложкаў і 5 аптэк. Істотна павялічылася колькасць медыцынскага персаналу. У 1899 г. у Брэсце працавалі 19 урачоў, 17 фельчараў, 7 павітух. Але і гэтай колькасці было недастаткова для амаль што 50-тысячнага горада.

Культурнае жыццё Брэста не адрознівалася разнастайнасцю. Свайго тэатра, які мог быць цэнтрам развіцця культуры, у горадзе не было. Між тым з тэатральным мастацтвам гараджане былі знаёмыя, дзякуючы гастраляваўшым тут у другой палове XIX ст. рускім (М. Барысава, М. Петыпа, А. Карпава), украінскім (Васільева і Гардоўскага), польскім (К. Камінскага, С. Навакоўскага, В. Клакоцкага, Я. Хелмікоўскага) тэатральнымі калектывамі. Тэатральныя трупы ставілі спектаклі ў непрыстасаваных памяшканнях, якія бралі ў арэнду. У горадзе існавалі і свае аматарскія калектывы. Так, з 1885 г. пачало дзейнасць брэсцкае музычна-драматычнае таварыства, пры якім існавала музычная школа.

Навучальныя ўстановы горада прадстаўляла павятовае дваранскае 3-класнае вучылішча, на базе якога ў 1865 г. была створана брэсцкая 4-класная мужчынская прагімназія. З 1853 г. у горадзе дзейнічала яўрэйскае 1-класнае вучылішча. Акрамя гэтага існаваў прыватны дзявочы пансіён, 4 прыватныя гімназіі, камерцыйнае вучылішча [1, с. 121].

Аднак ні адна з дзяржаўных навучальнах ўстаноў горада не давала неабходнай падрыхтоўкі для паступлення ва ўніверсітэты, таму гарадскі галава ў канцы XIX ст. хадайнічаў аб адкрыцці ў Брэсце, самым буйным горадзе губерні, класічнай гімназіі. Гэта просьба брастаўчан была задаволена толькі ў пачатку XX ст.

**Літаратура**

1. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Брэста: у 2 кн. / рэдкал. : Р.Р. Бысюк [і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 1997. – Кн. 1. – 576 с.

Таццяна Гераськіна (Брэст)

## АСАБЛІВАСЦІ ЎЖЫВАННЯ АД'ЕКТЫВАВАНЫХ ДЗЕЕПРЫМЕТНІКАЎ У ТВОРАХ ПІЛІПА ПЕСТРАКА

Дзеепрыметнік, як лічыць большасць усходнеславянскіх вучоных, з'яўляецца